ЯК У ПАРЫЖЫ

Дваццаць пяць гадоў сяброўства

Кожны год у маі на тры дні старажытны Нясвіж ператвараецца ў адну вялікую сцэнічную пляцоўку падчас свята мастацтваў «Музы Нясвіжа». Шмат эмоцый, уражанняў дораць арганізатары фестывалю — Міністэрства культуры Беларусі, Мінскі аблвыканкам, Нясвіжскі райвыканкам і заслужаны калектыў «Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі» жыхарам горада, шматлікім гасцям, прыхільнікам камернай музыкі.

На працягу многіх гадоў мастацкія фэсты ў Нясвіжы застаюцца адной з самых адметных падзей у культурным жыцці Беларусі. Штогод гэтыя інавацыйныя праекты яднаюць айчынную музыку розных эпох і жанраў. З моманту свайго заснавання і да сённяшняга дня фестываль з'яўляецца сімвалам узнаўлення і адраджэння гісторыі беларускага мастацтва, перш за ўсё — музычнага.

Сёлета фестываль адбыўся дваццаць пяты раз. Адкрыўся ён творчай сустрэчай з мастацкім кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Міхаілам Фінбергам. Перад жыхарамі горада, гасцямі і ўсімі прыхільнікамі мастацтва выступіў струнны квартэт з канцэртам «Музычныя скарбы Беларусі» пад кіраўніцтвам Таццяны Вайлавай. Гэты ж калектыў пазней выступіў у Тэатральнай зале палацавага ансамбля Радзівілаў з канцэртнай праграмай «Музычным шляхам роднай Бацькаўшчыны». У касцёле Божага Цела паказалі канцэрт «Духоўнае аблічча музычнай Беларусі».

А вечарам у раённым Цэнтры культуры адбыўся вялікі канцэрт «Мая краіна — мая сям'я» ў гонар 25-гадовага творчага сяброўства аркестра з несвіжанамі, падчас якога выступілі салісты аркестра — лаўрэаты шматлікіх конкурсаў. Сярод іх — заслужаная артыстка Беларусі Наталля Тамэла, таксама Галіна Грамовіч, Алеся Дзяржавец, Таццяна Глазунова, Дзмітрый Качароўскі, Руслан Мусвідас, Яўген Цымбаліст, Ягор Шаранкоў. У іх выкананні прагучалі песні, якія аб'ядноўваюць беларускі народ, сталі часткай яго духоўнага жыцця.

У межах свята праводзіцца пленэр для дзяцей — навучэнцаў школ мастацтваў. Пленэр носіць імя жывапісца Міхаіла Сеўрука. Кожны раз ён прысвечаны розным тэмам. Дзеці робяць кампазіцыйны пейзаж і пішуць два эцюды з натуры. На кожным пленэры юныя таленты наведваюць дом-музей знакамітага мастака.



Кватэра-музей Міхася Сеўрука

На ціхай зялёнай вулачцы Садовай у Нясвіжы прытуліўся драўляны дом, у якім з 1939 года да канца жыцця жыў і працаваў знакаміты беларускі мастак Міхась Сяўрук (Міхаіл Канстанцінавіч Сяўрук). У 1966 годзе тут была адкрыта кватэра-музей мастака. У 2012-м плошчу кватэры пашырылі і стварылі новую экспазіцыю. У калекцыю ўвайшлі жывапісныя работы майстра, графіка, гравюры на дрэве, медзі, лінолеуме, асабістыя рэчы мастака, якія перадала музею яго жонка Раіса Сямёнаўна і яго сябры.

Створаная экспазіцыя ўяўляе сабой разнажанравы паказ двух перыядаў творчасці мастака — віленскі (1927—1939) і нясвіжскі (1939—1979).

Нарадзіўся Міхась Сяўрук у Снове 27 лютага 1905 года. Сын чыгуначнага служачага. Да 1927 года вучыўся ў Нясвіжскай гімназіі. У 1932-м скончыў факультэт выяўленчага мастацтва Віленскага ўніверсітэта. Першыя работы маладога таленавітага творцы дэманстраваліся на выстаўках 1937—1938 гадоў у Варшаве. Тагачасная галерэя вобразаў, створаная ім, дакладна перадае атмасферу часу, адносіны да навакольнага свету, ідэалы прыгажосці. Больш познія работы адзначаюцца народнасцю вобразаў. У Нясвіжы ў асноўным працаваў у галіне жанравай карціны і пейзажа.

Сярод яго работ — тэматычныя кампазіцыі «На ўборцы буракоў», «Жніво», «Новы дом» і іншыя.

Акрамя таго, Сяўрук ілюстраваў вокладкі кніг. Напрыклад, зборнікі паэзіі Максіма Танка «На этапах», Рыгора Шырмы «Наша песня». Разам з Язэпам Драздовічам, Пятром Сергіевічам і Язэпам Гарыдам займаўся ілюстраваннем заходнебеларускіх друкаваных выданняў.

Памёр Міхась Сяўрук 14 сакавіка 1979-га ва ўзросце 74 гадоў. Пахаваны ў Нясвіжы. Яго карціны і графічныя работы знаходзяцца ў Беларусі, Польшчы, Літве. Да 100-годдзя з дня нараджэння мастака ў 2005 годзе ў Беларусі выпушчана паштовая марка з выявай яго карціны «Жніво».

Асвоілі медыяпрастору

Сёння ў рабоце з чытацкай аўдыторыяй патрабуюцца неардынарныя падыходы, новыя формы. Гэта добра разумеюць у Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Паўлюка Пранузы. І супрацоўнікі актыўна пазіцыянуюць бібліятэку ў інтэрнэт-прасторы. Функцыянуе сайт установы nesvizhlib.by, створана група «Чытаючы Нясвіж» і «БібліяДзеткі», «УКантакце», старонкі ў «ОК», «Інстаграм», «Фэйсбук», у 2020-м годзе запрацаваў канал на YouTube, з 2021 — на TikTok.

Для стварэння іміджу бібліятэчнай прафесіі супрацоўнікі ўстановы арганізавалі акцыю «Бібліятэкар — гэта прыгожа». У ёй прынялі ўдзел карыстальнікі «УК», а менавіта супрацоўнікі бібліятэчнай сферы незалежна ад узросту і месца жыхарства. Кожны сказаў у сваім відэа, што быць бібліятэкарам — гэта жыць у прафесіі, дзе заўсёды ёсць чаму павучыцца і дзе ёсць месца для адкрыцця новага.

Цікавым атрымаўся і анлайн-конкурс «Чытаюць дзеці на табурэце». У ім прынялі ўдзел 42 прадстаўнікі малодшай сярэдняй і старшай узроставых груп. Яны дасылалі відэа, дзе чытаюць любімы верш. Пераможцы атрымалі падарункі.

Яшчэ адзін анлайн-конкурс — «Моладзь чытаючай краіны», у якім удзельнічалі маладыя людзі ад 15 да 31 года. Яны аддалі на суд як індывідуальныя, так і калектыўныя творчыя работы ў трох намінацыях «Будзь у трэндзе» (стварэнне калекцыі літаратурных успамінаў), «Чытанне ў стылі сэлфі» (арыгінальныя, гумарыстычныя фотаздымкі, на якіх увасоблены момант зносін з кнігай), «Маладзёжная хваля чытання» (медыятворчасць).

Некалькі праектаў было прысвечана патрыятычнаму выхаванню: акцыя «Зорка героя», марафон чытання «1418 радкоў», анлайн-праект «Жывыя вуліцы». Менавіта апошні даў магчымасць пазнаёміць моладзь з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, з гісторыяй вуліц, названых імёнамі тых, хто аддаў сваё жыццё за мір, адзначыла **загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Кацярына ІЮЛЬСКАЯ.**

Яна таксама расказала, што бібліятэка з 2016 года актыўна займаецца развіццём міжнароднага супрацоўніцтва з шэрагам бібліятэк гарадоў — партнёраў Нясвіжа. Падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве з бібліятэкамі Пулавы, Тарнуў, Одалянуў (Польшча), Радзівілішкіса, Біржай (Літва), Аўцэ (Латвія).



Памяці паэтаў

У Нясвіжы прайшла гадзіна памяці паэтаў раёна Івана Гурбана, Міхася Сазончыка, Уладзіміра Богдана, Мікалая Бялевіча, Віталя Барадзіна. Пра іх гаварылі родныя, сябры раённага літаратурна-музычнага аб'яднання «Валошкі», удзельнікі ансамбля песні «Элегія» пад кіраўніцтвам Тамары Прыгун, хору ветэранаў «Аптымісты» (кіраўнік Ірына Латушка). У выкананні ўдзельнікаў ансамбля «Элегія» і хору «Аптымісты» гучалі лірычныя песні.

Прысутныя згадвалі жыццёвы і творчы шлях сваіх землякоў.

— Іван Гурбан пражыў доўгае і няпростае жыццё, — расказала **кіраўнік раённага літаратурна-музычнага аб'яднання «Валошкі» Валянціна ШЧАРБАКОВА.** — Яго сталасць выпала на той час, калі атэісты разбуралі храмы, рушылі людскія лёсы. У шасцідзясятыя гады ён узначальваў Юшавіцкі сельскі Савет. І калі адзін з начальнікаў загадаў яму залезці на дах Юшавіцкай царквы і зрэзаць крыж, то ён адмовіўся і быў зняты са сваёй пасады. У 72 гады Іван Яфімавіч стаў членам Саюза пісьменнікаў Беларусі. Пры жыцці выдаў кніжку для дзяцей «Чубаценькі будзільнік». Пасля смерці выйшла ў свет яго кніга «Паэт».

Вельмі цёпла і пранікліва расказала пра свайго бацьку Міхася Сазончыка яго дачка Ніна Няхай. Міхась Яфрэмавіч родам з Гарадзеі, паэт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Яго пяру належаць зборнікі «Пад родным небам», «Люблю», «Крыніца», «Выпрабаванне часам», «Роздум», а таксама зборнікі для дзяцей «Вераб'іная дача», «Навагодні светлячок», «Сонца мыецца».

Удзельнікі мерапрыемства падтрымалі ініцыятыву назваць бібліятэку ў Гарадзеі імем Міхася Сазончыка.

У 2007 годзе сябар раённага літаратурна-музычнага аб'яднання «Валошкі» Уладзімір Богдан выпусціў сваю першую кнігу «Нясвіжскі край». У 2010-м — другую — «Роднымі сцежкамі», праз год выйшла ў свет кніга для дзяцей «Міласэрнасць». Пасля яго смерці — зборнік паэзіі і прозы «Бацькоўскі парог». Усе кнігі, акрамя першай і апошняй, падрыхтавалі да друку супрацоўніцы раённай цэнтральнай бібліятэкі Таццяна Байкаш і Валянціна Шчарбакова.

Галоўны ўрач санаторыя Мікалай Бялевіч таксама пісаў вершы. Мікалай Сцяпанавіч аўтар некалькіх кніг. Цудоўную кнігу паэзіі «Спадчына» пакінуў пасля сябе і нясвіжскі паэт Віталь Барадзін. На жаль, яе не пабачыў: пайшоў з жыцця.

Сустрэча «Памяці паэтаў» адбылася напярэдадні Троіцкай памінальнай суботы, хоць першапачаткова планавалася на ліставад.

— І гэта таксама невыпадкова, — лічыць Валянціна Шчарбакова. — Спадзяёмся, што не толькі мы, але і Бог памянуў на нябёсах душы нашых паэтаў Івана, Міхаіла, Уладзіміра, Мікалая і Віталя.

Матэрыялы падрыхтавала Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. Фота Яна ХВЕДЧЫНА.